


**У Горках і акадэміі ўшанавана памяць аб Максіме Гарэцкім. 18 лютага 1993 года, у час святкавання 100-годдзя з дня яго нараджэння, была адкрыта мемарыяльная дошка пісьменніку на чацвертым корпусе акадэміі, тут жа дзейнічае музей-кабінет М.Гарэцкага. Яго імя прысвоена раённай бібліятэцы і адной з вуліц Горак.**

Алесь Пісьмянкоў

***

Восень.
Пагодзіна.
Горкі.
Цэдзіць святло маладзік.
Тут па былінных пагорках
Калісьці
Гарэцкі
хадзіў.
Гэтак жа падалі зоркі,
Антонаўкі спелі ў садах.

Пахла бульбоўнікам горкім
Калі ён
пра долю
гадаў.
Спеліў шчымлівае слова
Каб праўдаю высвеціць сказ,
Каб слова
дыхнула
жытнёва
І нам растлумачыла нас.

***"Усё жыццё праляцела, як адзін дзень. Усё яно – як на далоні. Цану рэчам пазнаў. Людзей да самых глыбінь уведаў. Жыццём даражыць навучыўся. І да смерці сябе рыхтаваць я ўмею. Каб прыняць яе меч хоць калі, і без пары, і без усякай патрэбы."***

**М. Гарэцкі "Скарбы жыцця"**

Бібліятэка імя Дз.Р. Новікава
Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі



# Адданы сын Беларусі

## (да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага)

***Гарэцкі Максім Іванавіч (1893-1938) — класік беларускай літаратуры, адзін з пачынальнікаў сучаснай беларускай прозы, крытык, літаратуразнаўца, лексікограф, мастак арыгінальнага, самабытнага таленту, вядомы прадстаўнік беларускай думкі, грамадскі дзеяч беларускага нацыянальна-дэмакратычнага Адраджэння і наш зямляк.***

## ПУНКЦІР ЖЫЦЦЁВАГА ШЛЯХУ

**18 лютага 1893 – нарадзіўся ў вёсцы Малая Багацькаўка Шамаўскай воласці на Мсціслаўшыне;**
**1901-1903 – вучыўся ў пачатковай школе ў суседняй Большай Багацькаўцы;**
**1903-1908 – працягваў вучобу ў Вольшы;**
**1909-1913 – вучоба ў Горацкім каморніцка-агранамічным вучылішчы;**
**1913 – жыве ў Вільні, працуе каморнікам, друкуеца ў “Нашай ніве”;**
**1914 – ідзе ў салдаты, удзельнічае ў баях першай сусветнай, быў паранены;**
**1916 – вучоба ў Паўлаўскім пяхотным вучылішчы ў Петраградзе;**
**1916-1917 – зноў на фронце, там сустрэў Лютаўскую рэвалюцыю;**
**1917 – цяжка хварэе, лечыцца ў Арле, Маскве. Жалезнаводску;**
**1918 – жыве ў Смаленску, шмат піша, працуе ў газеце “Звязда”;**
**1919 – працягвае працаваць у газеце “Звязда” ў Мінску і Вільні. Псля акупацыі Вільні белапалякамі працуе выкладчыкам беларускіх настаўніцкіх курсаў. У ліпені ажаніўся на Леаніле Усцінаўне Чаряўскай. У 1921 нарадзілася дачка Галіна, у 1922 – сын Леанід;**
**1922 – арыштаваны польскімі уладамі, высланы ў Коўна, потым пераязджае ў Дзвінск;**
**1923 – з сям’ёй пераязджае ў Мінск. Працуе на рабфаку БДУ;**
**1926 – пераезд ў Горкі, выкладае беларускую мову і літаратуру ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі;**
**1928-1930 – зноў у Мінску, прызначаны вучоным спецыялістам Інстытута навуковай мовы Інбелкульта;**
**18 ліпеня 1930 арыштаваны органамі дзяржаўнай бяспекі, высланы на 5 гадоў у Вятку;**
**1935-1937 – пераязджае ў гарадскі пасёлак Пясочня (з 1936 г. Кіраў Смаленскай вобласці), працуе настаўнікам рускай мовы ў Пясочанскай сярэдняй школе.**
**1937– у ноч з 3 на 4 лістапада па даносу яго арыштоўваюць другі раз;**
**1938 – пастановай тройкі ад 6 лютага Гарэцкі быў прыгавораны да растрэлу. Прыгавор быў прыведзены ў выкананне 10 лютага 1938 г. у 15 гадзін.**

**21 студзеня 1959 года пастановай Калужскага абласнога суда Гарэцкі быў поўнасцю рэабілітаваны.**

## СПАДЧЫНА МАКСІМА ГАРЭЦКАГА










**Сёння спадчына пісьменніка трывала займае пачэснае месца ў залатым фондзе беларускай класічнай літаратуры. І не толькі як дасканалы ўзор прыгожага пісьменства, скарб філасофскай думкі, што існуе па-за прасторай і часам. Напісаныя амаль стагоддзе таму кнігі Максіма Гарэцкага актуальныя і сёння. Уся яго творчасць прасякнута пачуццём любові да Радзімы, яе гісторыі, традыцый, нацыянальнай культуры. Нацыянальная ідэя натхняла пісьменніка, абуджала яго думку і пачуццё, вызначала змест творчасці. Максім Гарэцкі ўнёс каштоўны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры беларускага народа.**










***«Максіму Гарэцкаму належыць месца адно з важнейшых: месца класіка беларускай літаратуры. Побач з Купалам, Коласам, Багдановічам».***

***Алесь Адамовіч***